**УДК 39**

# КУЛЬТАВЫЯ ВАЛУНЫ БЕЛАРУСІ: СІМВАЛІЧНЫ СТАТУС І РЫТУАЛЬНЫЯ ФУНКЦЫІ

***Д. А. МАЛЧАНАВА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*Характэрнай рысай беларускага ландшафту з'яўляюцца шматлікія валуны, бо тэрыторыя Беларусі размешчана ў вобласці распаўсюджання старажытнамацерыковых абледзяненняў. Валуны займаюць асобнае месца ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў, яшчэ ў дахрысціянскую эпоху валуны былі аб'ектамі рэлігійнага пакланення. Традыцыя шанавання асобных сакральных захавалася на тэрыторыі Беларусі да пачатку XXI ст.*

***Ключавыя словы**: сакральныявалуны, камяні-следавікі, сакральная геаграфія Беларусі*

Адным з найбольш распаўсюджаных элементаў беларускай сакральнай тапаграфіі ёсць камень. У 1882 г. вядомы этнограф А. Кіркор адзначыў, што ў Літоўскім Палессі, пад якім разумеліся Віленская, Гродзенская і Ковенская губерніі, “няма амаль ніводнага вялікага каменя, які б не меў адметнай назвы і з якім не было б звязана якое-небудзь паданне”. Пра распаўсюджанасць легендарных камянёў на тэрыторыі краіны казаў у XIX ст. і М. Дзмітрыеў, падкрэсліваючы, што іх “знойдзецца вялікае мноства па ўсёй Беларусі”. У канцы XX ст. даследнікі налічвалі больш за 200 падобных аб'ектаў, прычым этнаграфічныя экспедыцыі апошніх гадоў выяўляюць новыя, раней не вядомыя навуцы, камяні, якія маюць адметны сімвалічны статус у карціне свету мясцовага насельніцтва. Аднак буйныя валуны як адметная рыса культурнага ландшафту сустракаюцца на тэрыторыі краіны нераўнамерна, што звязана з арэалам распаўсюджання апошняга ледавіку.“Калі параўнаць валуны з розных раёнаў Беларусі, высвятліцца цікавая заканамернасць. На поўначы, у Беларускім Паазер'і, іх максімальны памер дасягае 11 м, у цэнтральнай частцы, у межах Беларускай грады і прылеглых да яе раўнін, буйнейшых зв 6-8 м, бадай не знойдзеш. А на поўдні, на абшарах Беларускага Палесся, камень у 1-3 м – вялікая рэдкасць. Выходзіць, што з поўначы на поўдзень валуны не толькі драбнеюць, але і сустракаюцца радзей” [4. с, 251].

З'яўляючыся адметнай часткай ландшафту, валуны здаўна ўвайшлі не толькі ў матэрыяльную, але і духоўную культуру беларускага народа. У значнай ступені культавыя валуны звязаны з першабытнымі вераваннямі: шанаваннем аб'ектаў прыроды (камянёў, крыніц, дрэў), якія быццам бы маюць звышнатуральныя якасці (фетышызм), верай у тое, што асобныя камяні з'яўляюцца або раней былі жывымі істотамі (анімізм), а таксама з больш познімі рэлігійнымі вераваннямі (культам продкаў, язычніцтвам з яго шматлікімі антрапаморфнымі боствамі, хрысціянствам)[ 2.с, 47].

На камяні першабытны чалавек складаў ахвяры сваім багом, спраўляў на іх хаўтурныя трызны. На месцы вялікіх здарэнняў чалавек стаўляў камень. У каменных дамавінах (дольмэнах) хаваў нябожчыкаў і над магіламі накладаў з камення курганы. Як водгук гэтага яшчэ і цяпер чалавек на могілках кладзе камень. Камяню прыдавалася аблічча тых багоў, якіх выбражаў сабе чалавек таго часу. У часе хваробы да каменя звярталіся, шукаючы дапамогі; каменчыкі насілі, як амулеты самі і прывязвалі сваёй жывёле [5. с, 157].

Беларускія народныя ўяўленні пра магічныя, надзвычайныя здольнасці каменя грунтуюцца на спецыфіцы ягоных фізічных якасцяў (важкасць, шчыльнасць, цвёрдасць) і разнастайнасці формаў (гладкі, шурпаты, маленькі, вялікі і г. д). Апошняя акалічнасць ляжыць у аснове меркаванняў аб здольнасці камянёў расці. “Даўней камяні раслі вялікія, як хаты! Аднаго разу ішла Матка Найсвентша і збіла пальца аб камень, так заплакала рэўне і кажа: “Ах, каб даў Божа, каб вы ўжэ ад гэтае пары хаця растуць, але памалу і ужэ невялікі”. Характэрна, што ўяўленні пра здольнасць камянёў расці ўласцівыя для пажылых вяскоўцаў і сёння: “Я чула і знаю, што ў мяне ў агародзе ляжаў камень, і за нескальку лет падрос. Ну яны медленна растуць, але растуць камяні. Я знаю”.Пры гэтым паходжанне камянёў і іх неадзвычайныя здольнасці ў народнай свядомасці могуць звязвацца з міфічнымі часамі першапачатку і крэацыйнай дзейнасцю Бога: “Камяні стварыў Бог. Камяні могуць расці. Ёсць такі з вёсцы Радута. Там хацелі звярнуць камень, але не звярнулі, бо ўросшы быў у зямлю. І гэты камень расце па сёняшні дзень. Нельга мачыцца на камен, бо гэта прынясе няшчасце. Быў такі выпадак, калі чалавек з-за гэтага сламаў ногу…” [ 4.с, 252].

На сённяшні дзень на тэрыторыі Беларусі налічваецца больш за 300 культавых валуноў, больш за 100 месцазнаходжання камянных крыжоў і каля 30 каменных язычніцкіх ідалаў.Усе культавыя камяні можна падзяліць на два асноўныя тыпы: культавыя валуны і культавыя вырабы з валуноў. Першы з гэтых

тыпаў складаецца з наступных пяці класаў: магічныя валуны (фетышы), анімістычныя валуны (дзедавікі), дэістычныя валуны (багавікі), крыптагенныя валуны (валуны з ямкамі і выемкамі і валуны з малюнкамі, надпісамі, знакамі) [2. с, 49-50].

Адна з найцікавейшых разнавіднасцей культавых валуноў – камяні-следавікі. Адметнай асаблівасцю гэтых камянёў з'яўляюцца адбіткі слядоў на паверхні ў выглядзе ступні чалавека або лап звяроў і свойскіх жывёл. Выемкі на камянях падзеляюцца на прыродныя, форма якіх нагадвае след пэўнай істоты і штучныя. Вялікая колькасць камянёў-следавікоў сустракаецца на тэрыторыі Ўсходняй Еўропы, асабліва ў раёнах, блізкіх да Балтыйскага мора. У нашай краіне, у яе паўночнай і цэнтральнай частках, такіх камянёў даволі шмат[3. с, 31]. "*Той камень, даўней людзі гаварылі, што эта Божы след. Такі як чалавеччы, як ступня, і пальчыкі, усё. Камень вялікі, да паўчалавека, метр.Гаварылі толькі, што эта Божы след. Еты камень я знаю харашо, мы там сена гатовілі. Там селішча было, і кусцікі былі, і там камянёк. Хадзілі глядзелі. Адсюль з кілометр, яма дзе сенажная, і туды. Вы не найдзеця, дажа незатрудняйцеся. Я і сама забыла. Зарасло ўсё*"(Сенненскі р-н) [6. с,237]. "*Ну, яшчэ старыя прымерна так гаварылі, што Бога сляды. Даўно Бог ішоў, ступіў, ну во і слядкі. А тыя малыя (слядкі) – дык то, ці кот з ім (Богам) ішоў ці сабака. Слядкі там гэтыя чысцілі. Старыя людзі хадзілі і зерне туды, у слядкі, сыпалі, каб добры ураджай быў. – Як сеялі, сыпалі туды? – Ага, як сеялі. Ну, яшчэ хадзілі на Вялічка, яйкі свянцілі. Яшчэ на Троіцу хадзілі. – Як свянцілі? – Яйкі пакладуць у слядкі – во так свянцілі. – А на Тройцу? – Не, на Тройцу не свянцілі. Хадзілі, чысцілі тыя слядкі, ну прыбіралі там старыя бабкі*" (Лепельскі р-н) [6. с, 237].

Нярэдка камяні-следавікі знаходзяцца побач з культавай крыніцай і фарміруюць цэлый сакральный комплекс. "Ёсць у нас тут такая крыніца, ну во гэтыя кусты, і завецца Пушча. І там ёсць у нас святая крыніца. Ляжыць камень, а на ім мужчынскі ці бабскі босы след, што ўродзе босы станавіўся на эты камень. Еслі чалавек балеець, ды верыць Богу, ды ці глазы, ці што, то тады прікодзяць, і бралі ваду з крыніцы са святой. Я сама была ля гэтага каменю, сена граблі. Дзьве жэншчыны хадзілі піць да гэтай крыніцы ваду. Гавораць, нешта лечыць.." [4. с, 254].

У канцы XIX ст. шырокай вядомасцю карыстаўся камень "след Боскай Маткі". Легенды і паданні распавядаюць пра тое, што Божая Маці час ад часу спускаецца з нябёсаў і ходзіць па нашай зямлі, таемна дапамагаючы нямоглым. Адным з доказаў гэтага нібыта лічацца сляды з адбіткамі Яе ступні на камянях. Паводле сабранай інфармацыі, на Беларусі такіх валуноў некалькі дзесяткаў, і паўсюль іх называюць па-рознаму: След Маткі Боскай, След Божай Маці, След Багародзіцы, Стапа Божай Маці, След Святой Дзевы, След Найсвяцейшай Панны, След Дзевы Марыі і інш. На некаторых камянях можна заўважыць побач ямку - прынята лічыць яе следам ад кіёчка[3. с, 33]. "*Раней старыя гаварылі, што на гэты камень ступіла Найсвенчая Мацер Боская, і на ім застаўся слядок*" (Докшыцкі р-н) [7.с, 3].

Анімістычныя валуны, або пярэваратні. Гэта клас адлюстроўвае рэшткі архаічных вераванняў у тое, што валуны, як і некаторыя іншыя прыродныя аб'екты (напрыклад, дрэвы), з'яўляюцца або маглі раней быць жывымі істотамі. Сярод звестак аб валунах як акамянелых істотах, будынках і рэчах вылучаецца 6 сюжэтаў: акамянелыя аратыя разам з валамі за працу на Вялікдзень, акамянелыя вяселлі, акамянелыя краўцы ці шаўцы, акамянелыя людзі за розныя правіннасці, акамянелыя жывёлы і акамянелыя будынкі[2. с, 53].

Дэістычныя валуны (багавікі). Значную частку гэтага класа культавых валуноў займаюць валуны, якія звязаны з язычніцкімі боствамі. Найбольшай увагі заслугоўваюць валуны з імёнамі язычніцкіх боставаў. Так, камень каля в. Крамянец Лагойскага раёна завецца Даждзьбога камень (Святы камень), тры камені маюць назву Пярун (вёскі Папялы Глыбоцкага, Расходна Сенненскага раёнаў, на беразе воз. Дрывяты каля Браслава)[2. с, 58]. "*Гара Гараватка. Там Перуноў камень быў. Перуноў ён называецца патаму, што ў яго ўдарала молнія. Эта не пры маей памяці. Можа, эта мой дзед чуў, што ў яго Пярун ударыў. Казалі – дзе быў? – возле Перуновага каменя. Проста такія разгаворы*"(Лепельскі р-н) [6. с, 236].

Крыптагенныя валуны – гэта аб'екты, якія пакуль што нельга з упэўнасцю аднесці да якого-небудзь з вышэйназваных класаў. Да крыптагенных аднесены валуны з розной формы, ямкамі, нерасшыфраванымі малюнкамі, знакамі, надпісамі [2. с,61].

Паводле павер'яў, культавыя камні валодалі не толькі чароўнымі ды магічнымі здольнасцямі, але і выступалі як лекавыя сродкі і для чалавека, і для жывёл. Для гэтага досыць было дакрануцца да каменя і пакласці на яго ахвараванні: грошы, кветкі, цукеркі, саматканае палатно, і інш. У якасці лекаў выкарыстоўвалі таксама мох, што пакрываў камень, або яго адшчапаныя кавалачкі, якія расціралі на парашок, залівалі вадой і спажывалі ўнутрана [1. с, 114-155]. "*Там, дзе Падрэзы, на полі недалёка і быў той "Сьвяты камень". Зваўся так, што на ім сьлядочкі былі такія: кругловінка, як ад каленкі, і маленькая пятачка дзецкая. Гэта гаварылі, што даўным-даўно ішла па гэтым полі Багародзіца з сынам, і спатыкнуліся аб гэты камень. І сьлядочкі тыя засталіся: Багародзіцы і маленькага Ісуса*

*Хрыста. Тая вадзічка (што заставалася ў сьлядках), гаварылі, дужа памагае ад усякіх хваробаў. А яшчэгаварылі,што каля тога камяня, каля Сьвятога, ніколі зьмеі ня поўзалі*"(Бешанковіцкі р-н) [6. с, 236].

Святыя камяні ў народнай свядомасці выступалі рытуальнымі цэнтрамі лакальнай супольнасці, гарантамі яе стабільнасці і ўпарадкаванасці і займалі ў структуры культурнага ландшафту строга вызначанае месца. Што да сакральна вылучаных камянёў, якія не выконваюць (ці, прынамсі, страцілі) рытуальных функцый у жыцці мясцовай супольнасці, то ў структуры лакальнага культурнага ландшафту яны маюць выразную інфармацыйную нагрузку. "Чортавы камяні", "камяні- пярэваратні", а таксама "скарбавыя" і мемарыяльныя валуны нясуць у сабе інфармацыю сінхроннага і дыяхроннага тыпу [4. с, 255 ].

Такім чынам, валуны з'яўляюцца адметнай часткай ландшафту, могуць выступаць як месца святога і мець статус рытуальнага цэнтра, але і з другога боку суадносіцца і з інфернальнай сферай. Культ камня вядомы са старажытных часоў, пакланенне валунам характэрны для многіх народаў і рэлігій. Трэба адзначыць, што на тэрыторыі Беларусі культ камяня спалучае ў сабе як архаічныя (паганскія), так і хрысціянскія элементы.

ЛІТАРАТУРА

1. Дучыц Л. Сакральная геаграфія Беларусі / Л.Дучыц, І.Клімковіч. — Мінск: Літаратура і Мастацтва. – 2011. —349 с.
2. З глыбі вякоў. Наш край: Гіст.- культуралаг. 3-11 зб. Вып. 2. Навук. рэд. А. К. Краўцэвіч; Уклад. В. У. Шаблюк. — Мн.: Беларуская навука, 1997. — 240 с.
3. Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі / А. К. Карабанаў [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Інстытут прыродакарыстання. — Мінск : Беларус. Навука, 2011. — 235 с.
4. Лобач, У.А. Міф. Прастора. Чалавек : традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У. А. Лобач. — Мінск : Тэхналогія, 2013. — 511 с.
5. Мялешка, М. Камень у вераваннях і паданнях беларусаў / М. Мялешка // Зап. Аддзялення гуманіт. навук. Кн. 4. Працы катэдры этнаграфіі. — Менск: Інбелкульт, 1928. – Т. 1. – С. 155-182.
6. Полацкі этнаграфічны зборнік/ уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача.— Вып. 2. Ч. 1: Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. Ч. 1.—Наваполацк : ПДУ. — 2011. —290 с.
7. Таинственная Беларусь III: материалы конференции (г. Минск, 22 янв. 2017 г.) / Уфоком. – Минск: Регистр, 2017. — 224 с.